# ЗА ВЫСОКІ, УСТОЙЛІВЫ ЎРАДЖАЙ

## МОЛАДЗЬ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ РЫХТУЕЦЦА ДА СЯЎБЫ

Наступіла гарачая пара падрыхтоўкі да вясенне-палявых работ. Ад таго, як нашы калгасы, соўгасы і МТС падрыхтуюцца да сяўбы, будзе залежаць лёс ураджаю, забеспячэнне Чырвонай Арміі і насельніцтва харчаваннем, а прамысловасць—сыравінай.

Забяспечыць узорную падрыхтоўку да сяўбы—патрыятычная справа сельскай моладзі. Вось чаму падрыхтоўцы да сяўбы зараз павінна быць падпарадкавана ўся арганізацыйная і палітычная работа комсамольскіх арганізацый. У бліжэйшыя дні насенне павінна быць адсартыравана і праверана на ўсхожасць, закончан рамонт сельскагаспадарчага інвентара. З мэтай праверкі гатоўнасці калгасаў да веснавой сяўбы трэба арганізаваць пробныя выезды ў поле.

Комсамольцы закліканы забяспечыць строгі кантроль над захоўваннем насення, арганізаваць збор і вывазку на поле ўгнаення. Вялікую ўвагу патрэбна звярнуць на абучэнне малапрадуктыўных кароў для палявых работ. У любой справе комсамольцы павінны праяўляць уласную ініцыятыву, паказваць узоры працы, выступаць арганізатарамі моладзі.

Адказнай задачай райкомаў комсамола і пярвічных комсамольскіх арганізацый калгасаў з'яўляецца работа па стварэнню комсамольска-маладзёжных звенняў высокага ўраджаю.

У калгасах вобласці створана і працуе звыш 300 звенняў. Большасць райкомаў комсамола і пярвічных комсамольскіх арганізацый правільна зразумелі свае задачы ў справе падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы.

Комсамольская арганізацыя калгаса «Комінтэрн», Рубілкаўскага сельсовета, Дзержынскага раёна, налічвае 41 чалавек. Комсамольцы калгаса карыстаюцца павагай і аўтарытэтам сярод калгаснікаў. Сакратар комсамольскай арганізацыі Броня Маханёк

**І. ПАЛЯКОЎ,**
сакратар Мінскага абкома



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы